**З пасяджэння рэспубліканскага экспертна-манументальнага мастацкага савета Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**

*Экспертны савет збіраецца штотыднёва. Праведзена больш за дзесятак пасяджэнняў. На іх, поруч з іншымі неадкладнымі творчымі пытаннямі, пастаянна разглядаецца ход мастацкага аздаблення Нацыянальнай бібліятэкі: давядзення да ладу прылеглай тэрыторыі, фасадаў будынка, яго ўнутраных памяшканняў. Праца карпатлівая, напружаная і адказная, наўпрост звязаная з максімальным захаваннем цэласнасці, сашбытнасці знешняга і ўнутранага аблічча бібліятэкі. Аблічча гэтае ўжо зараз выразна адлюстроўвае набыткі не толькі беларускай, але і сусветнай культуры.*



Падчас пасяджэння савета.

# "Каб быў дасканалым Божы чалавек..."

23 жніўня, у дзень правядзення аднаго з саветаў, заканчвалася даводка ўваходнай бібліятэчнай зоны: фасадных крылаў скарынаўскіх буквіц "а" і "я", уладкаваных на калонах па баках сімвалічнай разгорнутай кнігі... Будаўнікі рыхтаваліся да мантажу ўваходных шыльдаў і помніка Скарыне... Як паведаміў старшыня савета скульптар Іван Міско, плённую працу над творамі, якія ўпрыгожаць бібліятэчныя інтэр'еры, працягвалі ў сваіх майстэрнях мастакі Вашчанка, Паплаўскі, Шарангові ч, Шчамялёў, Тоўсцік, Літвінава...

На пачатку пасяджэння сябры экспертнага савета абмеркавалі скульптурна-пластычны рэльеф "Космас" Івана Міско. Праца, у якой аўтар выяўляе свой погляд на філасофію жыцця, бясконцасць неўтаймаваных стваральных памкненняў чалавека, таксама стане часткай інтэр'ернага аздаблення Нацыянальнай бібліятэкі.

Савет выязджае на скульптурны камбінат. На яго ным двары побач з помнікам Янку Купалу скульптараў Льва і Сяргея Гумілеўскіх (неўзабаве ён будзе адпраўлены для ўстаноўкі ў Маскву) чакае свайго часу бронзавая постаць Францішка Скарыны — будучая візітоўка бібліятэкі. Помнік выпраменьвае светлае, залацістае ззянне.

— Такі колер, — сцвярджае скульптар Алесь Дранец, — самы прыдатны для поўнага раскрыцця вобраза асветніка, першадрукара, чалавека шматграннага і самаахвярнага, які цяплом душы і святлом думкі сваёй натхніў нашчадкаў на самаспазнанне і самаўдасканаленне...

Сябры савета аднадушна зацвярджаюць колеравае рашэнне аўтара. Далейшы маршрут выязнога пасяджэння — да будынка Нацыянальнай бібліятэкі. Побач з яе гмахам ідзе праца па ўкладцы пліткі ля п'едэстала будучага помніка Скарыне. На левым уваходным крыле — выразаная ў бетоне фраза са скарынаўскай Бібліі: "Каб быў дасканалым Божы чалавек", перакладзеная на мовы свету. Справа — выказванні з твораў Тураўскага, Буднага, Гусоўскага, Купалы...

Каб быў дасканалым чалавек... Дзеля гэтага і старающца зараз будаўнікі, спяшаюцца дызайнеры і мастакі, хвалюецца дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі, як руплівы гаспадар, для якога не існуе дробязей.

— Сачу і за мастацкім аздабленнем інтэр'ераў, і за станам інжынерных сістэм, — расказвае ён. — Усё важнае, усё галоўнае. За ўсё баліць душа...

У майстэрнях Саюза мастакоў сябры савета агледзелі і зацвердзілі эскізны праект афармлення абводных (кальцавых) калідораў першага і другога паверхаў і атрыума (унутранай прасторы), абмежаванага гэтымі калідорамі.

— Над канкрэтнымі творамі працуюць зараз больш за 60 мастакоў, — паведамляе старшыня манументальнай секцыі Саюза мастакоў Уладзімір Крываблоцкі. — Гэта дзесяць — пятнаццаць прадстаўнікоў ад кожнай секцыі. Вялікі і працаздольны аўтарскі калектыў. Жывапіс, графіка, скульптура, узоры дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва размесцяцца ў 31 нішы абводных калідораў... Працаваць для аздаблення такой архітэктуры — гонар для кожнага з нас!..

Прастора атрыума будзе запоўнена кампазіцыямі, прысвечанымі шасці абласцям Беларусі і гораду Мінску. У рамках кожнай адлюстраваны характэрныя для беларускіх мясцовасцей ландшафты, нацыянальныя строі, алегарычныя сімвалы.

**Андрэй СТАРЖЫНСК**



Праект інтэр'ера адной з чытальных залаў.



Эскізны праект афармлення інтэр'ераў бібліятэкі.



А.Кішчанка. "Зорка Венера". Габелен.